# Будучыня, заснаваная на традыцыях

**Мастацкая галерэя «Універсітэт культуры» запрашае на выстаўку «Высокае неба». Праект знаёміць з работамі выкладчыкаў і студэнтаў кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. У экспазіцыі прадстаўлены творы, выкананыя ў розных відах і тэхніках, якія адлюстроўваюць каштоўнасныя арыенціры грамадства.**



*Наталля Лінькова «Дрэва жыцця», 2025 г.*

Выстаўка не мае агульнай тэмы, якая б чырвонай ніткай аб'ядноўвала ўсе работы. Аднак многія ўдзельнікі толькі пачынаюць свой творчы шлях, таму прадметы мастацтва звязвае ідэя пошуку сваёй індывідуальнасці, самабытнага выказвання, мастацкіх эксперыментаў і адкрыццяў, якія пазней сфарміруюць унікальны стыль майстра. У экспазіцыі прадстаўлены розныя віды мастацтва: ад класічнага жывапісу да традыцыйнай выцінанкі. Студэнты спрабуюць пераасэнсаваць вопыт былых пакаленняў і прыстасаваць старадаўнія віды мастацтва да новых рэалій. Так у працэсе навучання на аснове традыцыйных тэхнік ствараюцца новыя цікавыя і актуальныя творы, у якіх адлюстроўваецца творчая інтэрпрэтацыя багатай культурнай спадчыны народа, увасобленай у сучасным дызайне. Прыемна бачыць, як выцінанка, маляванка, ткацтва працягваюць жыць і развівацца ў творчасці маладых мастакоў.



*Кацярына Раньшава «Балотніцы», 2025 г.*

Маляванка найбольш шырока прадстаўлена ў экспазіцыі. Творы Марыі Катралёвай («Начныя палёты», 2024) і Кацярыны Раньшавай («Балотніцы», 2025, «У цікім віры», 2025) адсылаюць гледачоў да славянскай міфалогіі. Можна заўважыць, што ў сваёй творчасці аўтары натхняліся работамі беларускай мастачкі Алены Кіш. Канешне, гэта ўжо не тыя маляванкі, якія ўпрыгожвалі вясковую хату, аднак новае прачытанне традыцыйнага мастацтва арганічна ўпісваецца ў сучасны інтэр'ер і становіцца яркім акцэнтам у гарадской кватэры.

Звярнуліся студэнты і да народнага ткацтва, спалучаючы традыцыйную тэхніку і актуальныя вобразы. Самай папулярнай формай стаў габелен, сюжэты для якога знайшліся ў беларускай літаратуры і фальклоры. Эльвіра Лібузер («Зорны шлях», 2024),



*Алена Шаціла «Раніца вясны», 2025 г.*

Святлана Матвейчык («Звычайнае»), Вікторыя Патапенкава («Адлюстраванне», 2024), Маргарыта Захарава («Замалёўка», 2024), Кацярына Раманенка («Вышэй неба», 2024) натхніліся тэмай прыроды, дзе пануюць спакой і вечная гармонія. Абстракцыю можна ўбачыць у творчасці Наталлі Купцовай («Пачатак», 2020) і Кацярыны Мяркулавай («Сіняя вечнасць», 2022).

Сярод студэнтаў набірае папулярнасць кераміка, робячыся адным з вядучых кірункаў студэнцкай творчасці. Удзельнікі выстаўкі смела эксперыментуюць з формамі, колерамі і вобразамі, знаходзячы новы фармат мастацкага выказвання. У экспазіцыі дэманструюцца вырабы з гліны, паліву, шамоту і інш. Тут можна ўбачыць посуд з нацыянальным беларускім арнаментам, статуэткі герояў беларускіх народных казак, легенд і паданняў. Аўтарам цяжка было спыніцца на адным творы, таму гледачоў чакаюць цэлыя керамічныя кампазіцыі. У праекце ўзялі ўдзел студэнты з Кітайскай Народнай Рэспублікі Лі Цзяй і Лі Лін. Яны таксама звяртаюцца да тэмы народных звычаяў і расказваюць пра традыцыйныя кітайскія танцы, якія і сёння з'яўляюцца адметнай часткай святочных мерапрыемстваў, тэатральных пастановак і фестываляў.



*Эльвіра Лібузер «Зорны шлях», 2024 г.*

Каванне рэдка дэманструецца на падобных выстаўках, аднак экспазіцыя галерэі «Універсітэт культуры» дае гледачам магчымасць дакрануцца да сучаснай формы гэтага віду дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў выкананні беларускіх майстроў. На выстаўцы можна пазнаёміцца з работамі Сяргея Кудзікава «Гуканне вясны» (2024) і «Жылі людзі, верылі ў цмока» (2025).

Творы, выкананыя ў тэхніцы «валенне лямцу», здзіўляюць разнастайнасцю форм і сюжэтаў. Многія дагэтуль лічаць, што лямец выкарыстоўваецца толькі для дываноў і адзення, аднак маладыя творцы разбураюць гэтыя стэрэатыпы, ствараючы карціны, пано, скульптуры і аўтарскія арт-аб'екты.

Якая мастацкая выстаўка абыходзіцца без класічнага жывапісу? Студэнты Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў працуюць у розных стылях, але большасць удзельнікаў аддаюць перавагу абстракцыянізму і экспрэсіянізму.

Праект спадабаецца і тым, хто лічыць сябе прыхільнікам традыцыйных відаў мастацтва, і тым, хто цікавіцца творчасцю сучасных беларускіх майстроў. Падобныя выстаўкі — гэта магчымасць пазнаёміцца з будучыняй айчыннага мастацтва, пакуль яна толькі фарміруецца ў творах маладых аўтараў.

**Лізавета КРУПЯНЬКОВА,**
**фота аўтара**